# ВОБРАЗ ЛЮСТЭРКА Ў ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ

**Л. П. Леська**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,*
*вул. Савецкая, 18, 220030, г. Мінск, Беларусь, leska.l.5@yandex.by*

Даследуецца спецыфіка выяўлення вобраза люстэрка на матэрыяле мастацкіх тэкстаў літаратуры Беларусі XIX ст. Адзначана, што карані светапогляднага зместу вобраза люстэрка ўзыходзяць да міфалагічнай свядомасці, для якой люстэркавасць была прынцыпам пазнання свету і адной з форм яго духоўнага засваення.

Асветлена litaraturaзнаўцаў: У. Эко, А. Вуліса, М. Бахціна, і вучоных Тартускай школы.

У працы адзначаецца, што ў апавяданнях Я. Баршчэўскага, баладах Я. Чачота вобраз люстэрка служыць сімвалічным сродкам раскрыцця ўнутранага свету герояў, спосабам іх самапазнання, асэнсавання свайго месца ў свеце.

У баладах Я. Чачота, А. Міцкевіча і апавяданнях Я. Баршчэўскага вобраз люстэрка асвятляе ўзаемаадносіны чалавека і свету, выступае спосабам перастварэння рэчаіснасці.

***Ключавыя словы:*** люстэрка; люстэркавасць; рамантызм; Я. Баршчэўскі; Я. Чачот; А. Міцкевіч.

# ОБРАЗ ЗЕРКАЛА В ЛИТЕРАТУРЕ БЕЛАРУСИ XIX ВЕКА

**Л. П. Лесько**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Белорусский государственный педагогический университет им. Максима Танка,*
*ул. Советская, 18, 220030, г. Минск, Беларусь, leska.l.5@yandex.by*

Исследуется специфика выявления образа зеркала на материале художественных текстов литературы Беларуси XIX в. Отмечено, что корни мировоззренческого содержания образа зеркала восходят к мифологическому сознанию, для которого зеркальность была принципом познания мира и одной из форм его духовного освоения.

Освещено разноаспектное исследование образа зеркала, мотива зеркальности в работах современных литературоведов: У. Эко, А. Вулиса, М. Бахтина и ученых Тартуской школы.

В работе отмечается, что в рассказах Я. Барщевского, балладах Я. Чечота образ зеркала служит символическим средством раскрытия внутреннего мира героев, способом их самопознания, осмысления своего места в мире.

В балладах Я. Чечота, А. Мицкевича и рассказах Я. Борщевского образ зеркала освещает взаимоотношения человека и мира, выступает способом пересотворения действительности.

***Ключевые слова:*** зеркало; зеркальность; романтизм; Я. Борщевский; Я. Чечот; А. Мицкевич.

# THE IMAGE OF A MIRROR IN THE LITERATURE OF BELARUS OF THE NINETEENTH CENTURY

**L. P. Lesko**

*PhD, Ass. Professor,*
*Belarusian State Pedagogical University named after Maksim Tank,*
*Sovetskaya str., 18, 220030, Minsk, Belarus, leska.l.5@yandex.by*

The article examines the specifics of identifying the image of a mirror based on the material of literary texts of the literature of Belarus in the 19th century. It is noted that the roots of the ideological content of the image of the mirror go back to the mythological consciousness, for which mirroring was the principle of cognition of the world and one of the forms of its spiritual assimilation. The article highlights the multidimensional study of the image of a mirror, the matter of mirroring, looking glass in the works of modern literary critics: V. Eco, A. Ulis, M. Bakhtin, and scientists of the Tartu school. The work notes that in the stories of Y. Borshchevsky, the ballads of Y. Chechot, the mirror serves as a symbolic means of revealing the inner world of the characters, a way of their self-knowledge, understanding their place in the world. The image of a mirror in the ballads of Ya. Checheta, A. Mickiewicz and the stories of Ya. Borshchevsky acts as a method of reflecting man and the world and a way of re-creating reality.

***Keywords:*** mirror; mirroring; romanticism; Ya. Borshchevsky; Ya. Chechot; A. Mickiewicz.

Карані светапогляднага зместу вобраза люстэрка адыходзяць у міфалагічную свядомасць, для якой люстэркавасць была прынцыпам пазнання свету, адной з форм яго духоўнага засваення. У старажытныя часы люстэрка, выконваючы функцыі адлюстравання, адбітку і трансфарматара, выступала адначасова сродкам пакарання, пагібелі, выратавання, абароны. У міфе пра блізнят люстэрка выконвала космасаўпарадкавальную функцыю, што становіцца відавочным пры разглядзе «сваяцкіх» сувязяў паміж боствамі, напрыклад, Феба-багіня месяца, сястра бога сонца). У міфе пра Персея люстэрка несла герою гібель, таму ён, баючыся быць ператвораным у камень, сочыць за медузай Гаргонай па адбітку на медным шчыце. У міфе пра Нарцыса люстэрка ахоўвае чалавека ад страты асабістай цэласнасці. Нарцыс парушыў мяжу паміж сабой і адбіткам, парушыў дыхатамію «я» – «не я». Старажытныя міфы разглядалі чалавечыя недахопы памяркоўна, матывуючы і абумоўліваючы іх (напрыклад, імкненне Нарцыса да вады асэнсоўвалася як натуральная з’ява: ён жа сын патоку і Наяды). Негатыўная роля адбітку, адлюстравання была абумоўлена смяротнасцю вады, якая несла забыццё.

Фальклорныя ўяўленні таксама зафіксавалі разнастайныя ўяўленні пра люстэрка. У народных павер’ях разбітае люстэрка прадвяшчала няшчасце, пустое, без адбітку сведчыла пра ўваход нячыстай сілы ў жыццё чалавека.

Вобраз люстэрка з’яўляўся не толькі прадметам міфалагічных і фальклорных твораў, але і з’явай літаратуры, што прыцягвала да сябе ўвагу шматлікіх літаратуразнаўцаў. Адной з першых прац, у якой вывучалася функцыянаванне люстэрка ў мастацкай літаратуры стала манаграфія А. Вуліса «Літаратурныя люстэркі», у якой матыў,

вобраз, сімвал люстэрка разглядаецца на вялікім матэрыяле фальклору, сусветнай літаратуры.

Функцыі, семантыка вобразаў люстэрка і залюстроўя даследавалася ў працах М. Бахціна, вучоных Тартускай школы. Для М. Бахціна люстэрка з'яўляецца спосабам самапазнання героя праз яго адбітак.

Першым спецыяльным даследаваннем семіётыкі люстэркавасці стала эсэ «Люстэркі» У. Эка. Італьянскі вучоны, разглядаючы магчымасці аптычнага аб'екта, што выступае ў якасці знаку, разглядае яго месца ў індывідуальнай практыцы чалавека.

Глыбокі семіятычны падыход у вывучэнні люстэрка прадстаўлены ў працах вучоных Тартускага ўніверсітэта (С. Залян, Ю. Левіна, Л. Сталовіча). Аўтары зборніка «Люстэркі. Семіётыка люстэркавасці» [3] даследуюць функцыю вобраза, разглядаюць яго як мяжу паміж «сваім» – «чужым», «гэтым» і «тым», «жывым» і «нежывым» светамі, паміж знешнім і ўнутраным. Люстэрка для тартускіх вучоных з'яўляецца механізмам арганізацыі карціны свету, што будуецца на супрацьпастаўленні розных светаў. Здольнасць люстэрка выступіць у якасці мяжы вызначае яго дадатковыя магчымасці, звязаныя з арганізацыяй структуры мастацкага свету.

Люстэрка – поліфункцыянальны прадмет, які мае мноства сэнсаў і сімвалічных значэнняў. Прадметна-рэчыўны аналіз вобраза прапаноўваюць сучасныя даследчыкі постмадэрну (Ж. Бадрыйяр, М. Фуко [4]). Псіхалагічны аспект раскрыты ў працах Ж. Лакана, Ж-П Сартра, дзе таямнічы вобраз люстэрка – інструмент фарміравання Я-канцэпцыі і самасвядомасці.

Сімвалічны аспект люстэрка праяўляецца ў тым, што гэты прадмет уведзены ў літаратуру, дзе ён фіксуе часавыя і прасторавыя характарыстыкі ў мастацкім тэксце, раскрывае двайніковае жыццё герояў.

Сэнсаваўтваральныя магчымасці вобраза люстэрка ў мастацкіх тэкстах пісьменнікаў-рамантыкаў літаратуры Беларусі XIX стагоддзя (А. Міцкевіча, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага) раскрываюцца пры характарыстыцы вобразаў і сіметрычнасць кампазіцыі.

У мастацкай канцэпцыі твораў Я. Баршчэўскага вобраз люстэрка звязаны з вобразамі двайнікоў (апавяданне «Плачка», «Стогадовы стары і чорны госць»), з трагічным матывам непазнавання сябе (апавяданне «Белая сарока»), з матывам шматмернасці і розназўзроўневасці міфапаэтычнай прасторы і часу (апавяданні «Пра чарнакніжніка і цмока…», «Ваўкалак»), таму што з пункту погляду (зроку), у мастацкіх тэкстах пісьменніка можа быць любая рэч, любая з'ява, любы феномен, які ў той ці іншай ступені, падпарадкаваны законам оптыкі. Вобразамі-эквівалентамі люстэрка з'яўляюцца двайніковасць: сон і снабачанні, водная паверхня вады (апавяданне «Жабер-трава»), партрэтнае палотна (апавяданне «Вогненныя духі»), фотаздымак у альбоме, цень на сцяне (апавяданне «Стогадовы стары і чорны госць»).

Так, у апавяданнях «Белая Сарока», «Вогненныя духі» Я. Баршчэўскага люстэрка служыць своеасаблівым адбіткам духоўнага свету галоўнай гераіні. Мальвіна (апавяданне «Вогненныя духі») не ацаніла добрых намераў Альберта, не прыняла яго шчырае пачуццё, а толькі думала пра багацце, таму і стала ў адзін шэраг з голымі німфамі, што сышлі з палотнаў. «Голасць» німфаў сімвалічна паркрэслівае душэўную пустату Мальвіны, якая, апроч грошай, нічога і не любіць.

Люстэрка асвятляе і ўнутраны свет пана Скамарохі (апавяданне «Белая Сарока») Я. Баршчэўскага, паводле зместу твора, «надвячоркам, у прыцемках у пакоі сядзіць пан Скамароха (твар якога такі круглы, што нагадвае поўню), падкручваючы свой вус, пільна ўглядаецца ў люстэрка. Нечакана над яго жытлом павіслі хмары, зашумеў за сцяною вецер і лінуў дождж. У пакоі цёмна, толькі цьмяна свяціліся шыбы» [5, с. 205]. І прыходзіць да Скамарохі пасланнік Белай Сарокі, які мае вельмі непрывабнае аблічча. Герой Я. Баршчэўскага палохаецца нечаканага госця, але той супакойвае яго, заўважыўшы: «Не крычы, я падобны да цябе і магу табе шмат добрага зрабіць» [5, с. 206]. Скамароха глядзіць ў люстэрка, але не бачыць свайго сапраўднага твару, агіднасць яго аблічча становіцца відавочнай у час параўнання са страшным нячысцікам.

У мастацкай філасофіі Я. Баршчэўскага вобраз люстэрка асвятляе ўнутраны свет герояў, прынцып люстэркавасці ў кампазіцыі твораў пісьменніка падпарадкаваны раскрыццю адзінства свету.

У баладах Я. Чачота, А. Міцкевіча, Т. Зана люстэрка не толькі сродак самапазнання героя, але і спосаб яго выпраўлення, ператварэння чалавека.

У баладзе «Бекеш» Я. Чачота функцыю люстэрка выконвае крыштальная гара, па якой рухаецца галоўны герой твора, удзельнічаючы ў спаборніцтве за руку Малгосі, зусім забыўшыся, што кляўся ў каханні іншай. Нечакана ўсхаджаецца бура, і Бекеш ляціць з гары ўніз і разбіваецца, толькі напамінам аб ім засталася Бекешава гара; своеасаблівым адгалоскам жыцця папа і пападзі ў Пазяневічах стаў «звон на горцы ў Пазяневічах» (балада Я. Чачота «Падземны звон на горцы ў Пазяневічах»), які даносіцца з зямных глыбіняў.

Вобраз люстэрка ў баладзе «Бекеш» Я. Чачота служыць своеасаблівай меркай вартасці чалавека, сродак яго адлюстравання і перасатварэння. Такую сімвалічную функцыю люстэрка выконвае і ў баладах «Свіцязь», прадстаўленых у творчай спадчыне А. Міцкевіча, Я. Чачота і Т. Зана. Вобраз воднага люстэрка застаецца на месцы былога горада як знак яго праведнасці або грахоўнасці.

Такім чынам, у рамантычных творах літаратуры Беларусі XIX ст. шматфункцыянальны вобраз люстэрка выконвае ролю мастацкага адлюстравання свету, чалавека і перасатварэння рэчаіснасці.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Вулис А*. Литературные зеркала. Москва : Сов. писатель, 1991.

2. *Эко Умберто*. О зеркалах и другие истории / Умберто Эко; перевод с итальянского. Москва : Слово/Slovo, 2020 .

3. Зеркало. Семиотика зеркальности. [Ред. З. Г. Минц]. Тарту: ТГУ, 1988.

4. *Фуко Мишель*. Слова и вещи [Текст]: Археология гуманит. наук : пер. с фр. / Мишель Фуко ; вступ. статья канд. филос. наук Н. С. Автономовой. Москва: Прогресс, 1977.

5. *Баршчэўскі Я.* Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / пер. з пол. мовы, паслясл. і камент. М. В. Хаустовіча. Мінск : Юнацтва, 1996.